# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

5 студзеня 2018 г. № 3 г.Мінск

Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

У мэтах стымулявання і сацыяльнай падтрымкі дзейнасці ў галіне фізічнай культуры і спорту п а с т а н а ў л я ю:

1. За актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія садзейнічаюць гарманічнаму фарміраванню асобы, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2017 года ў памеры 100 базавых велічынь кожнаму:

Навіцкаму Уладзіміру Мікалаевічу, карэспандэнту спецыяльнаму аддзела каментатараў галоўнай дырэкцыі тэлеканала ”Беларусь 5“;

Скварцовай Віялеце Максімаўне, спартсмену-інструктару нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы ўстановы ”Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па лёгкай атлетыцы“;

Уласавай Вользе Анатольеўне, галоўнаму трэнеру нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па скачках на батуце ўстановы ”Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па гімнастычных відах спорту“.

2. Міністэрству фінансаў выдзеліць з рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Міністэрству спорту і турызму неабходныя сродкі на выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2017 года.

3. Не абкладаць падаходным падаткам з фізічных асоб сумы спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Беларускі спартыўны Алімп“ 2017 года, якія выплачваюцца ў адпаведнасці з дадзеным Указам.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

Администрация Президента Республики Беларусь * 1 *
Для правовых актов

24